УДК [741.9.041(092)Драздовіч+391.4:687.45](476)

**Марыя ВІННІКАВА**

*Вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства.*
*Сфера навуковых інтарэсаў: традыцыйны беларускі касцюм і тэкстыль, жаночыя галаўныя ўборы ручніковага тыпу.*
*Аўтар практычнага дапаможніка "Возрождение ремесла: пособие по ручному узорному ткачеству" (в соавт., Мн., 1993), ілюстраванага каталога "Скарбы з вясковых куфраў: Традыцыйны касцюм і тэкстыль з калекцыі "Народнае мастацтва Беларускага Палесся" (у суаўт., Мн., 2009), "Гарсэт, кабат, шнуроўка: безрукаўка ў беларускім народным адзенні" (Мн., 2010), альбома "Традыцыйны беларускі касцюм" (у суаўт., Мн., 2016, 2024) і больш за 200 навуковых артыкулаў.*



# Малюнкі Язэпа Драздовіча

## як крыніца для вывучэння народнага жаночага касцюма

**Ключавыя словы:** *этнаграфічныя малюнкі Драздовіча, народны касцюм, жаночыя галаўныя ўборы*



*Язэп Драздовіч.*

**Язэп Нарцызавіч Драздовіч — незвычайная асоба ў гісторыі беларускага мастацтва. У сваіх фантазіях і марах ён быў здольны вандраваць па касмічных абшарах, маляваць жыццё на іншых планетах. Але, будучы зямным чалавекам, ён востра адчуваў зменлівасць жыцця і неабходнасць дакладна фіксаваць усё, што існавала разам з ім, што яго акаляла. У выніку сёння мы можам убачыць тое, што даўно знікла, але захавалася як гістарычная і культурная спадчына на малюнках Язэпа Драздовіча, зробленых на паперы алоўкам і тушшу. Гэта страчаныя помнікі драўлянага дойлідства, не кранутыя цывілізацыяй палескія краявіды, а таксама беларусы, апранутыя ў традыцыйнае адзенне.**

Значная частка графічных твораў Язэпа Драздовіча, на якія абапіраецца ў даследаванні аўтар дадзенага артыкула, знаходзіцца ў зборах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага музея Літвы. Ёсць яны таксама ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Этнаграфічныя малюнкі Драздовіча прыцягваюць увагу сваёй фатаграфічнай дакладнасцю. Гэта ў свой час адзначыў даследчык традыцыйнага беларускага касцюма Міхась Фёдаравіч Раманюк: "*Паводле партрэтных малюнкаў у профіль і тры чвэрці можна дакладна рэканструяваць спосаб завівання і аздаблення пінскай наміткі, уявіць характэрны вобраз беларусак, які складаўся стагоддзямі*" [1, с. 82]. Сапраўды, на малюнках Я. Драздовіча можна знайсці шмат каштоўнай інфармацыі для вывучэння асаблівасцяў традыцыйнага адзення жыхароў Палесся (альбом "*Палессе. Піншчына*", 1926 г.) [2, с. 128—145], а таксама іншых мясцін Беларусі (альбомы "*Дзісеншчына. Тыпы з-пад Галубіцкай пушчы*", 1925 г.; "*Кабета з-пад Шчорсаў на Наваградчыне ў традыцыйным жаночым строі*", 1927 г. і інш.).

На малюнках Я.Драздовіча, дзе людзі адлюстраваныя ў поўны рост, дакладна перададзены агульны сілуэт фігуры, прапарцыянальныя суадносіны розных частак адзення, іх форма, нават асаблівасці крою і аздаблення, а таксама спосабы нашэння розных кампанентаў. Характэрныя рысы беларускіх народных строяў, якія так скрупулёзна замалёўваў Драздовіч, сёння маюць важнае навуковае і практычнае значэнне. Яны могуць



*Мастацкая студыя Язэпа Драздовіча пры Віленскай беларускай гімназіі. 1926—1927 гг.*

*Я. Н. Драздовіч. Беларус-паляшук з в. Дубнавічы. 1926 г. Папера, туш. 28×18 см. Крыніца: "І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў" (склад. Н.В.Мартынава). С. 145.*



быць скарыстаныя ў дзейнасці музеяў пры стварэнні экспазіцыйна-выставачных візуальных вобразаў, пры рэканструкцыі страчаных частак традыцыйнага беларускага адзення, а таксама сучаснымі мадэльерамі, што працуюць у этнастылі. Так, на малюнку "*Беларус-паляшук з в. Дубнавічы*" (зараз в. Дубнавічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл.), датаваным 1926 г., выразна паказаны вобраз селяніна ў світцы, аперазанай вузкім, хутчэй за ўсё плеценым поясам. Світка даволі доўгая, закрывае калені, мае косы запах крысаў, невысокі стаячы каўнер і шырокія закаўрашы па нізе рукавоў. З-пад світкі бачная сарочка з адкладным каўняром, сцягнутым вузкай стужкай. Сарочка арнаментаваная па краі каўняра і ўздоўж пазушнага разрэза. Касцюм палешука дапоўнены саламяным капелюшом з высокім верхам і шырокімі палямі, зручным для балоцістых палескіх мясцін абуткам — лыкавымі лапцямі з вяровачнымі валокамі, якія высока абвіваюць ногі разам з нагавіцамі [1, с. 83; 2, с. 145; 3, іл. 91].

З вялікай любоўю Драздовіч адлюстроўвае на малюнках беларускае жаночае адзенне. Цікавасць для нас уяўляе малюнак "*Беларускі палескі строй жанчын-зарачанак з астравоў пінскіх балот. Вёскі Парэ і Марочна*" (зараз в. Парэ Пінскага р-на Брэсцкай вобл., Рэспубліка Беларусь, і с. Марочнае Зарэчненскага р-на Ровенскай вобл., Украіна).

На малюнку ў профіль у поўны рост адлюстравана замужняя жанчына. Яна апранута ў доўгую спадніцу з падвойным папярочным шляхам па падоле. Спераду бачны арнаментаваны фартух, які карацейшы за спадніцу. Кароткая (да каленяў) світка мае адкладны каўнер, праразную кішэню з бачнага нам правага боку, шырокія закаўрашы на рукавах і невялікія



Я. Н. Драздовіч. Беларускі палескі строй жанчын-зарачанак з астраваў пінскіх балот. Вёскі Парэ і Марочна. 1926 г. Папера, туш. 27,8×19,5 см.



Я. Н. Драздовіч. Антося з в. Старое Марочна. Беларускі палескі строй дзяўчат-зарачанак. 1926 г. Папера, туш. 28×17,7 см.

Крыніца: "І рай і боль на Песеннай Зямлі… Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў" (склад. Н.В.Мартынава). С. 138.



Я. Н. Драздовіч. Кабета ў каўпаку (чапцы) з в. Дубнавічы. 1926 г. Папера, туш. Крыніца: Язэп Драздовіч : альбом-манаграфія. Іл. 89.

разрэзы па баках унізе. Па таліі світка аперазаная даволі шырокім тканым поясам з рамбічным арнаментам. Яго доўгія канцы, упрыгожаныя махрамі, звісаюць з правага боку ніжэй за край фартуха. На нагах — скураны абутак, які ледзь выглядвае з-пад доўгай спадніцы.

Галава жанчыны павітая намітkай, якая спераду пакідае адкрытай частку валасоў, расчэсаных на прамы радок. Цвёрды каркас у выглядзе абручыка з лубу або кардону, надзеты на галаву пад намітку, надае адпаведную форму верхняй частцы галаўнога убору, які дадаткова упрыгожаны стужкай, хутчэй за ўсё, чырвонага колеру, што падкрэслівае ўрачыстасць святочнага строю. У зграбнасці сілуэта жанчыны, з замілаваннем адлюстраваных дэталях яе строю адчуваецца вялікая павага мастака да мадэлі, да яе прыгажосці і майстэрства. Сваім знешнім выглядам яна годна дэманструе традыцыйную культуру свайго народа [1, с. 83; 2, с. 138; 3, іл. 94] .

Драздовіч не імкнуўся да навукова дакладнай фіксацыі асаблівасцяў дадзенага строю. Ён замалёўваў вобраз жанчыны, які яго ўразіў. Тым не менш мастацтвазнаўчы аналіз адлюстраванага ім галаўнога убору дазваляе выказаць меркаванне пра спосаб яго стварэння. На нашу думку, разгорнутая ва ўсю шырыню намітка накладалася на галаву паверх цвёрдага каркаса ў форме шырокага абручыка. Правы яе канец, складзены ў некалькі столак, шчыльна ахопліваў падбародак, падымаўся уверх з левага боку і ў разгорнутым выглядзе перакідваўся цераз галаву зноў направа, дзе пакрываў плячо і вуглом спадаў на спіну. Левы канец, складзены ў паласу шырынёю ў далонь, верагодна, спачатку накіроўваўся назад, абыходзіў кругом галавы па утворанай каркасам форме і фіксаваўся ззаду вузлом з доўгай пятлёй, якая потым накладвалася на сярэдзіну галавы і ішла наперад, дзе, магчыма, прышпільвалася да абручыка.

Малюнак "*Антося з вёскі Старое Марочна. Беларускі палескі строй дзяўчат-зарачанак*" [1, с. 81; 2, с. 138; 3, іл. 95] дае ўяўленне пра складнікі летняга строю дзяўчыны, іх прапарцыянальныя суадносіны, месцы размяшчэння арнаменту і яго характар. Не забыўся мастак паказаць і тое, што дзявочая спадніца запрасаваная ў рабрыстыя складкі, невялікая хустачка павязана кругом галавы канцамі назад, а шыю шчыльна ахоплівае нізка з дзвюх нітак караляў.

Старажытны жаночы галаўны убор з *наміткай* — павівалам ручніковага тыпу, які ў пачатку XX ст. і нават у другой палове 1920-х гг. яшчэ шырока ўжываўся ў вёсках Палесся, вельмі цікавіў мастака. Відавочна, Драздовіча здзіўляла разнастайнасць яго формы, абумоўленая як наяўнасцю розных прылад для яе стварэння, так і якасцю палатна наміткі — ад даволі грубага і шчыльнага да танюткага і празрыстага. Імкнуўся ён замалёўваць і розныя спосабы завівання наміткі, якія адпавядалі традыцыям пэўнай мясцовасці, а таксама ўзросту і статусу жанчын.

З вялікім захапленнем мастак рабіў партрэтныя замалёўкі жанчын у галаўных уборах. Яму нават удалося намаляваць адну маладую кабету з в. Дубнавічы толькі ў сподні кампаненце убору — чапцы, хаця

у такім выглядзе жанчыны не павінны былі з'яўляцца перад чужым чалавекам. Пад сплеценым з нітак чапцом бачная прычоска — валасы, гладка зачэсаныя на два бакі і навітыя на шырокі валік круглай формы, які ўкладзены вакол патыліцы [3, іл. 89].

Пажылую кабету з той жа вёскі Драздовіч намаляваў у завітай паверх чапца намітцы. Тонкая тканіна ахутвае галаву жанчыны і выяўляе рэльефную форму прычоскі. Адзін канец наміткі (адпаведна малюнку — правы), складзены даволі шырокай паласой, праходзіць пад падбародкам і перакідваецца цераз сярэдзіну галавы зноў на правы бок. Левы канец, складзены ў вузкую палоску, на нашу думку, ідзе назад, абручыкам абыходзіць кругом галавы ніжэй рэльефнага валіка, утворанага прычоскай, і фіксуецца вузлом ззаду або справа. Пры гэтым ён прыціскае перакінуты цераз галаву правы канец, які яшчэ раз праходзіць пад падбародкам. З левага боку ён замацоўваецца абвіваннем абручыка, утворанага левым канцом, і звісае ўніз удоўж спіны [3, іл. 93]. Апошнія два малюнкі знаходзяцца ў зборы Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.

Некалькі партрэтных замалёвак жанчын у намітках былі зроблены Драздовічам у м. Сернікі, якое ў канцы XIX — пачатку XX ст. уваходзіла ў склад Пінскага павета Мінскай губерні Расійскай Імперыі, а зараз — с. Сернікі Зарэчненскага раёна Ровенскай вобласці ва Украіне. Тры з гэтых малюнкаў, зробленых тушшу на паперы, захоўваюцца ў зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. На іх адлюстраваныя жанчыны рознага ўзросту. Іх галаўныя ўборы маюць агульныя рысы, але розняцца некаторымі асаблівасцямі спосабаў завівання намітак. Агульным з'яўляецца тое, што ўсе тры наміткі выраблены з даволі шчыльнага палатна, што бачна па адлюстраванай мастаком пругкасці іх формы ў завітым стане. Па нашым меркаванні, яны маюць прыблізна аднолькавыя памеры і па краях аздоблены вузкімі бардзюрамі геаметрычнага арнаменту. Тры наміткі ахопліваюць падбародак і шырокім абручыкам абыходзяць кругом галавы. Мясцовай адметнасцю галаўнога ўбору з'яўляецца тое, што адзін канец наміткі, складзены ў чатыры столкі, звісае над ілбом.



*Я.Н.Драздовіч. Кабета ў намітцы з в. Дубнавічы. 1926 г. Альбом "Палессе. Піншчына". Папера, туш. Нацыянальны музей Літвы. Крыніца: Язэп Драздовіч: альбом-манаграфія. Іл. 93.*



*Я.Н.Драздовіч. Жанчына ў намітцы з м. Сернікі. 1926 г. Папера, туш. 18,1×11,9 см. Крыніца: "І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў" (склад. Н.В.Мартынава). С. 128.*



*Я.Н.Драздовіч. Жанчына сталага ўзросту ў намітцы з м. Сернікі. 1926 г. Папера, туш. 18,1×11,9 см. Крыніца: "І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў" (склад. Н.В.Мартынава). С. 130.*

У маладзейшай жанчыны спераду бачны зачэсаныя на бакі цёмныя валасы, а другі канец наміткі падаткнуты зверху пад абручык з правага боку [2, с. 128]. У жанчыны сярэдняга ўзросту валасы менш бачныя спераду, а другі канец наміткі вольна апушчаны ззаду ўздоўж спіны [2, с. 130]. У старой жанчыны валасы цалкам закрытыя. Яе галаўны ўбор адрозніваецца асаблівай кампактнасцю і парадкам завівання наміткі, другі канец якой наогул не бачны. Відаць, згодна з традыцыяй, пажылыя кабеты павінны былі завіваць свае наміткі так, каб другі іх канец не "целяпаўся" ззаду [2, с. 131].

З трох адзначаных вышэй малюнкаў Драздовіча самым інфарматыўным з'яўляецца першы, на якім выяўлена маладая жанчына. Аўтар артыкула ўжо рабіла спробу рэканструяваць спосаб нашэння гэтага галаўнога ўбору [4, с. 356—357, 359—360]. Аднак на той час рэканструкцыя мела тэарэтычны характар — з-за адсутнасці наміткі з с. Сернікі або да яе падобнай па памерах і якасці палатна спосаб завівання нельга было ўдакладніць метадам практычнага мадэлявання.

Непадалёку ад с. Сернікі знаходзіцца в. Гарадная — у мінулым знакаміты ганчарны цэнтр, вядомы сваёй белаглінянай керамікай не толькі ў гэтым рэгіёне, але і па-за яго межамі. У канцы XIX — пачатку XX ст. яна была вядома як мястэчка Гародна і таксама ўваходзіла ў Пінскі павет Мінскай губерні. Форма галаўных убораў замужніх жанчын у м. Гародна і м. Сернікі была падобнай, але крыху адрознівалася. Спосаб завівання наміткі з м. Гародна быў рэканструяваны аўтарам артыкула паводле музейнага прадмета са збору Расійскага этнаграфічнага музея (г. Санкт-Пецярбург, Расійская Федэрацыя), які захоўваецца там у завітым стане [5]. Адноўлены спосаб завівання быў правераны метадам практычнага мадэлявання. Атрыманы галаўны ўбор завяршыў жаночы строй з в. Гарадная, усе кампаненты якога ёсць у музейным зборы аддзела старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.



*Спосаб завівання наміткі. М. Сернікі Пінскага павета Мінскай губерні. Рэканструкцыя і малюнак М.М.Віннікавай паводле малюнка Я.Н.Драздовіча са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. КП 6247/34 (публікуецца ўпершыню).*



*Я.Н.Драздовіч. Старая ў намітцы з м. Сернікі. 1926 г. Папера, туш. 18,1×11,9 см. Крыніца: "І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў" (склад. Н.В.Мартынава). С. 131.*

Строй быў прадстаўлены ў альбоме "*Традыцыйны беларускі касцюм*" [6, с. 101], а таксама на выстаўцы "*Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм*" (Мінск, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, 09.09.2023 — 10.01.2024).

На падставе малюнкаў Язэпа Драздовіча можна выказаць меркаванне, што наміткі жанчын з м. Сернікі па шчыльнасці палатна і па аздабленні былі блізкімі да тых, што бытавалі ў м. Гародна. Спосаб завівання наміткі цесна звязаны з яе памерамі. Паколькі нам невядомыя памеры наміткі з м. Сернікі, было вырашана правесці параўнальны аналіз памераў намітак з блізкіх да яго беларускіх вёсак (на аснове прадметаў з музейных збораў Беларусі). Так, памеры намітак з музейнай калекцыі аддзела старажытнабеларускай культуры, складаюць: 265×38 см (в. Гарадная Столінскага р-на Брэсцкай вобл., КП-2103/Т-776); 252×38 см (в. Гарадная Столінскага р-на Брэсцкай вобл., КП-2579/Т-1523); 260×43 см (в. Востраў Пінскага р-на Брэсцкай вобл., КП-2617/Т-1560).

Недалёка ад украінскага с. Сернікі знаходзіцца таксама беларуская в. Парэ (Пінскі р-н Брэсцкай вобл.). Намітка з гэтай вёскі захоўваецца ў зборы Музея Беларускага Палесся, што ў Пінску (ПОМ-9948/В-692). Яе памеры: 256×43 см. Пад час экспедыцыі 2011 г. у в. Гарадная аўтарам была зафіксавана намітка, памеры якой складалі 263×39 см.




*Жанчына ў галаўным уборы, створаным на падставе рэканструяванага спосабу завівання наміткі з м. Сернікі Пінскага павета Мінскай губерні. Мадэль С.А.Белаш, завіванне М.М.Віннікавай, фота Ф.П.Лысенкі. 2024 г. (публікуецца ўпершыню).*

Як бачна з прыведзеных дадзеных, памеры намітак, што бытавалі ў наваколлі м. Сернікі, вагаліся ў межах 252—265 см па даўжыні і 38—43 см па шырыні. Праведзены аўтарам практычны эксперымент з выкарыстаннем наміткі падобных памераў дазволіў удакладніць зробленую раней тэарэтычную рэканструкцыю спосабу стварэння жаночага галаўнога ўбору з м. Сернікі. Вынік эксперымента ў выглядзе апісання спосабу завівання, аўтарскай графічнай рэканструкцыі і фотаздымкаў сучаснай мадэлі ў намітцы, завітай адноўленым спосабам, прадстаўлены ў артыкуле.

**Верагодная прычоска.** Намі ўжо згадвалася, што валасы жанчыны расчэсвалі на прамы радок, дзялілі на дзве часткі і навівалі на круглы валік, зроблены з туга скручанай пасмы льну, абшытай палатном. Прычоску размяшчалі на макушцы і замацоўвалі надзетым зверху сеткаватым чапцом, сплеценым з нітак.

**Спосаб завівання наміткі.** Намітка накладвалася на галаву ў разгорнутым выглядзе і пры гэтым валасы над ілбом заставаліся крыху адкрытымі. Злева быў яе карацейшы канец. Ён меў даўжыню прыкладна да сярэдзіны далоні апушчанай уніз левай рукі. Абодва канцы складваліся ў чатыры столкі: спачатку ўдвая, а потым пругавыя бакі наміткі падгортваліся ўнутр. Адкрытыя краі складзеных канцоў былі накіраваныя да твару. Левы канец праходзіў пад падбародкам, дзе падгінаўся ўдвая, пасля чаго падымаўся ўверх з правага боку і разгортваўся зноў да шырыні чатырох столак. Правы канец накіроўваўся назад і двойчы абыходзіў вакол галавы. Пры першым абароце ён прыціскаў сабой падняты з правага боку левы канец. Пад час другога абароту левы канец наміткі абвіваў яго паўтара раза і спускаўся над ілбом, а правы канец ішоў далей кругом галавы і ззаду працягваўся знізу ўверх пад утвораным ім жа абручыкам. Потым ён накіроўваўся да месца абвівання яго левым канцом і падтыкаўся пад абручык такім чынам, што яго невялікі кончык з арнаментаваным краем тырчаў уверх з правага боку. Лішак правага канца звісаў невялікай пятлёй ззаду. Галаўны убор дадаткова замацоўваўся шпількай, якая размяшчалася справа ў ніжняй частцы абгорнутага вакол абручыка левага канца наміткі.

Праведзенае навуковае даследаванне графічнай спадчыны Язэпа Драздовіча садзейнічала выяўленню асаблівасцяў традыцыйнага касцюма палескай часткі беларуска-украінскага памежжа. Была зроблена навуковая рэканструкцыя аднаго з варыянтаў мясцовых спосабаў завівання старажытнага жаночага галаўнога ўбору ручніковага тыпу — наміткі — з м. Сернікі. Метад практычнага мадэлявання дазволіў праверыць спосаб завівання, адноўлены паводле малюнка Язэпа Драздовіча.

---

1. Раманюк, М. Этнаграфічныя малюнкі Язэпа Драздовіча / М. Раманюк // Спадчына. — 1994. — № 3 (105). — С. 78—83.

2. І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў = И рай и боль на Песенной Земле... Беларусь глазами художников 1920—1930-х годов : альбом / склад. Н. В. Мартынава. — Мн. : Бел. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2020. — 208 с.

3. Язэп Драздовіч : альбом-манаграфія / уклад. М. Купава. — Мн. : Белітфонд, 2002. — 180 с.

4. Віннікава, М. Головні убори в традиційному жіночому костюмі білорусько-українського пограниччя (Західне Полісся) / М. Віннікава // Народознавчі зошити. — 2018. — № 2 (140). — С. 353—362.

5. Віннікава, М. М. Мастацка-пластычныя асаблівасці традыцыйнага касцюма мястэчка Гародна Пінскага павета Мінскай губерні / М. М. Віннікава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі" ; навук. рэд. А. І. Лакотка. — Мн., 2013. — Вып. 14. — С. 380—387.

6. Віннікава, М. М. Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional belarusian costume : альбом / М. М. Віннікава, П. А. Богдан. — Мн. : Беларус. навука, 2016. — 302 с.

*Паступіў у рэдакцыю 28.04.2026.*